*Родная газета на роднай мове*

# ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

1 КРАСАВІКА 2008 г. АЎТОРАК

№ 61 (26174)

Кошт 430 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 Г.

**Прамая лінія**

## ЯК ПАПЯРЭДЗІЦЬ АСТЭАПАРОЗ І ЯК З ІМ ЗМАГАЦЦА?

З цягам часу косці чалавека становяцца больш крохкімі, у выніку чаго развіваецца такое захворванне, як астэапароз. Яно пагражае сур'ёзнымі ўскладненнямі — пераломамі пазваночніка, шыйкі сцягна. Апошняя траўма найбольш небяспечная. У выніку яе 25 працэнтаў хворых гіне, 50 працэнтаў застаецца глыбокімі інвалідамі.

Як пазбегнуць такога пералому? Што рабіць, калі ён ужо здарыўся? Якія метады прафілактыкі і лячэння хваробы ёсць сёння? Гэтыя і іншыя пытанні вы можаце задаць падчас «прамой лініі» **загадчыцы кабінета астэадэнсітаметрыі Рэспубліканскага цэнтра медыцынскай рэабілітацыі і бальнеалячэння Наталлі Аляксееўне ВАСІЛЬЕВАЙ.** ***«Прамая лінія» адбудзецца 11 красавіка ў пятніцу з 15.00 да 16.30 па нумарах 8 (017) 292 38 92 і 292 38 21. Папярэднія пытанні можна пакінуць па тэлефонах 8 (017) 287 18 36 (Вольга Шаўко) і 287 18 29 (Святлана Барысенка).***

## Дэпутаты плануюць разгледзець больш як 110 законапраектаў

**У іх ліку праект закона аб Нацыянальным сходзе, падрыхтоўка якога знаходзіцца на завяршальнай стадыі, а таксама праект закона аб інфармацыі, інфарматызацыі і абароне інфармацыі. Аб гэтым Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнку праінфармаваў старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Вадзім Папоў.**

2 красавіка адкрываецца 8-я сесія Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу. Кіраўнік дзяржавы праінфармаваны аб будучай заканатворчай дзейнасці дэпутатаў.

На сустрэчы абмеркаваны ў тым ліку і пытанні фарміравання міжнароднага прававога поля. Як вядома, Прэзідэнтамі Беларусі, Расіі і Казахстана прынята рашэнне аб стварэнні Мытнага саюза. Цяпер завяршаецца работа над першымі дакументамі. Як адзначыў Вадзім Папоў, беларускі бок гатовы да сінхранізацыі правядзення ўнутрыдзяржаўных працэдур па гэтых пытаннях з кіраўнікамі парламентаў Расіі і Казахстана. На маючай адбыцца сесіі дэпутаты разгледзяць таксама пагадненні з Польшчай, Літвой і Латвіяй у сувязі з уступленнем гэтых краін у Шэнгенскую зону. Паводле слоў Вадзіма Папова, падрыхтоўка гэтых дакументаў практычна завершана і ў бліжэйшы час яны паступяць у Палату прадстаўнікоў. У цэнтры ўвагі знаходзіліся таксама пытанні, якія датычацца завяршэння паўнамоцтваў дэпутатаў гэтага склікання і іх далейшага працаўладкавання. Прэзідэнт падкрэсліў, што веды і вопыт народных выбраннікаў будуць запатрабаваны ў дзяржаве. Дэпутатаў гэтага склікання чакае работа і на восеньскай сесіі, дзе будзе прыняты бюджэт на наступны год. Вадзім Папоў паведаміў аб тым, што ў 2008 годзе ў поўным аб'ёме будзе выканана выкладзенае ў мінулагоднім пасланні Прэзідэнта беларускаму народу і парламенту патрабаванне аб скарачэнні тэрмінаў разгляду праектаў законаў да 1 года.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## Банкі павінны павялічыць долю інвестыцыйных крэдытаў

**Такую задачу паставіў 31 сакавіка Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы са старшынёй праўлення Нацыянальнага банка Пятром Пракаповічам.**

Таксама Прэзідэнт запатрабаваў актывізаваць у краіне работу па нарошчванні інвестыцый у эканоміку, каб іх аб'ём у гэтым годзе ў параўнанні з 2007 годам павялічыўся не менш як на 25 працэнтаў.

Прэзідэнту было далажана аб ходзе выканання Асноўных напрамкаў грашова-крэдытнай палітыкі Беларусі ў першым квартале 2008 года. Пётр Пракаповіч паведаміў, што ўсе прагнозныя паказчыкі выконваюцца, плацежная сістэма функцыянуе без збояў, працэнтная, крэдытная палітыка праводзіцца ў строгай адпаведнасці з планамі.

Афіцыйны курс беларускага рубля да долара ЗША за першы квартал гэтага года ўмацаваўся на 0,2 працэнта, або на Br5. Кіраўнік Нацбанка запэўніў, што такое ўмацаванне нацыянальнай валюты будзе адбывацца і ў далейшым, таму што яно грунтуецца на эфектыўнай рабоце беларускай эканомікі. Так, выручка прадпрыемстваў нашай краіны ад экспарту тавараў і паслуг за студзень—сакавік 2008 года павялічылася ў 1,56 раза ў параўнанні з аналагічным перыядам мінулага года. Золатавалютныя рэзервы Беларусі на канец сакавіка дасягнулі $5,5 млрд. Іх нарошчванне будзе прадоўжана.

Акрамя таго, размова ішла аб праводзімай урадам і Нацыянальным банкам рабоце па праграме развіцця будаўнічай галіны Беларусі, рэалізацыя якой дасць магчымасць да 2011 года выйсці на ўзровень будаўніцтва жылля ў краіне ў аб'ёме не менш як 10 млн кв.м у год. У гэтых мэтах магутнасці будаўнічых прадпрыемстваў плануецца павялічыць у 2 разы. Кіраўнік дзяржавы адобрыў меры і падыходы па вырашэнні задач развіцця будаўнічай індустрыі.

Пётр Пракаповіч паведаміў, што ўжо вызначаны ўсе крыніцы фінансавання запланаваных мерапрыемстваў, якія датычацца, у тым ліку, вытворчасці будматэрыялаў, умацавання вытворчай базы будаўнічых прадпрыемстваў. Усяго на гэтыя мэты за 3 гады плануецца накіраваць Br4,3 трлн крэдытаў банкаў. «Гэта беспрэцэдэнтны аб'ём крэдытавання, які дасць нам магчымасць фактычна стварыць новую будаўнічую індустрыю, новыя магутнасці, і дазволіць выканаць даручэнні кіраўніка дзяржавы па павелічэнні аб'ёмаў узводзімага ў краіне жылля», — адзначыў кіраўнік Нацбанка.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## Павышаецца адказнасць за якасць вырабляемых тавараў

**Адпаведныя меры прадугледжаны ўказам № 186 «Аб некаторых мерах па павышэнні адказнасці за якасць айчынных тавараў», які 27 сакавіка падпісаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.**

Дакументам уводзіцца абавязковае, а не па вырашэнню бакоў у дагаворы, устанаўленне працягласці тэрміну на тэхнічна складаны тавар, які, як правіла, не можа быць менш за два гады.

Павялічваецца перыяд часу, на працягу якога вытворца абавязаны забяспечыць рамонт, абслугоўванне тэхнічна складанага тавару, пастаўку запасных частак на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь. Цяпер гэты абавязак будзе выконвацца вытворцам на працягу ўсяго тэрміну вытворчасці тавару, пасля зняцця тавару з вытворчасці — на працягу тэрміну службы тавару, а пры адсутнасці такога тэрміну — на працягу 10 гадоў з дня спынення выпуску тавару (цяпер прадугледжана патрабаванне на перыяд гарантыйнага тэрміну, тэрміну прыдатнасці тавару, а калі гэтыя тэрміны не ўстаноўлены, то ў межах двух гадоў з дня перадачы тавару пакупніку або ў межах больш працяглага тэрміну, калі такі тэрмін устаноўлены заканадаўствам або дагаворам куплі-продажу).

Устанаўліваецца няўстойка ў памеры 0,1 працэнта ад кошту няякаснага тавару за кожны дзень перавышэння прадугледжаных указам тэрмінаў для яго рамонту, замены або прадастаўлення тавару аналагічнай якасці на час, неабходны для замены тавару. Бакі дагавора маюць права ўстанавіць больш высокі памер няўстойкі. Рэалізацыя палажэнняў указа будзе садзейнічаць павышэнню якасці тэхнічна складаных тавараў айчыннай вытворчасці.

Указ уступае ў сілу праз месяц пасля яго афіцыйнага апублікавання, за выключэннем асобных пунктаў.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## У школу без спазненняў



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

***Учора закончыліся вясновыя канікулы ў навучэнцаў беларускіх школ, гімназій і ліцэяў. Лунінецкі школьнік спяшаецца на ранішнія заняткі.***

**Адказвае натарыус**

## Завяшчанне можна скласці на каго заўгодна

***Ці можа ўласнік жылля завяшчаць свой дом староннім людзям? Ці будзе здзелка правамоцная, калі ў доме ўласніка прапісана яго сястра? Справа ў тым, што 20 гадоў таму пайшоў з жыцця мой бацька. Маці паўторна выйшла замуж. Дзяцей у гэтым шлюбе няма, у айчыма таксама не было дзяцей да шлюбу з маці. Мае дзеці лічаць яго родным дзедам, ён таксама іх любіць. Айчым мяне не ўдачараў. Ён мае ва ўласнасці палову жылога дома і хоча яе завяшчаць маім дзецям. Разам з ім пражывае і прапісана яго сястра-пенсіянерка. У сельскім Савеце, куды звярнуліся па параду, сказалі, што лепш афарміць завяшчанне на жонку, г.зн. на маю маці. Маўляў, мае дзеці з'яўляюцца чужымі людзьмі і здзелка можа быць прызнана несапраўднай. Дарэчы, з-за таго, што ў доме прапісана сястра айчыма, потым праблем не ўзнікне? Парайце, як лепш зрабіць?***

**(Адрас і прозвішча па просьбе не ўказваюцца), Мядзельскі раён**

— Рэгулюючы спадчынныя адносіны, закон прадаставіў грамадзянам права на свой погляд распараджацца на выпадак смерці маёмасцю, якая ім належыць. Такое распараджэнне можа быць вырашана толькі адным спосабам — шляхам складання завяшчання. Выключна ад волі завяшчальніка залежыць выбар асобаў, якім пяройдзе маёмасць пасля смерці завяшчальніка. Грамадзянін можа пакінуць па завяшчанні як усю сваю маёмасць, так і канкрэтную яго частку аднаму ці некалькім грамадзянам, што ўваходзяць або не ўваходзяць у кола спадчыннікаў па закону, г.зн. як родным, так і староннім людзям. Таму муж вашай маці можа пакінуць завяшчанне як на яе карысць, так і на карысць вашых дзяцей.

Што датычыцца другога пытання: ці будзе здзелка правамоцнай, калі ў доме ўласніка прапісана яго сястра? Прапіска ў завешчаным жылым доме асобаў, якія не з'яўляюцца спадчыннікамі па завяшчанні, не з'яўляецца падставай для адмены завяшчання ці прызнанні яго несапраўдным. Завяшчанне можа быць прызнана часткова несапраўдным, калі ў завяшчальніка на дзень смерці меліся спадчыннікі, што мелі права на абавязковую долю (непрацаздольныя дзеці, бацькі, муж ці жонка), якія былі пазбаўлены спадчыны па завяшчанні. Аднак асобы, якія мелі права пражывання ў спадчынным жылым памяшканні да дня смерці спадчынадаўца, не пазбаўляюцца гэтага права і пасля афармлення спадчыннікам сваіх спадчынных правоў на жылое памяшканне.

## Аформіць згоду мужа, толькі калі ніхто не супраць

***З'яўляюся інвалідам II групы па агульным захворванні. З мужам разведзена. Двое непаўнагадовых дзяцей пражываюць з ім. Свайго жылля не маю, таму здымаю кватэру. Хацелася б стаць у чаргу для атрымання сацыяльнага жылля. Але мне адмовілі, матывуючы тым, што ў мяне вялікая пенсія — 253 000 рублёў, якая не дазваляе стаць у такую чаргу. Параілі дамовіцца з колішнім мужам, каб ён даў пісьмовы дазвол на прыцягненне дзяцей да пастаноўкі мяне ў чаргу, бо ў гэтым выпадку мая пенсія, з улікам дзяцей, будзе складаць на чалавека менш за 185 000 рублёў. Мае пытанні: ці можна такі дакумент аформіць у натарыуса і як гэта зрабіць? Ці не пагражае гэта колішняму мужу тым, што дзяцей я змагу забраць ад яго сабе (ён гэтага не жадае)?***

**З.В. Супруновіч, г. Мінск**

— Натарыусы пры ажыццяўленні натарыяльнай дзейнасці кіруюцца заканадаўствам Рэспублікі Беларусь і абавязаны адмовіць грамадзяніну ў здзяйсненні натарыяльнага дзеяння, калі яно супярэчыць патрабаванням закона.

У апісанай вамі сітуацыі ў натарыяльным парадку можна толькі аформіць згоду колішняга мужа на ўключэнне непаўнагадовых дзяцей у члены вашай сям'і з вызначэннем месца жыхарства дзяцей па месцы вашай рэгістрацыі. Аформіць дакумент без намеру стварыць прававыя наступствы натарыус не мае права. Акрамя таго, натарыус здзяйсняе натарыяльныя дзеянні толькі пры згодзе ўсіх зацікаўленых асобаў. У выпадку яе адсутнасці пытанне падлягае разгляду ў судовым парадку. Ці не пагражае такая сітуацыя колішняму мужу тым, што дзяцей вы зможаце забраць да сябе? У адпаведнасці з артыкулам 74 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб шлюбе і сям'і, месцам жыхарства дзіцяці лічыцца месца жыхарства яго бацькоў. У выпадку асобнага пражывання бацькоў з-за скасавання шлюбу ці па іншых прычынах месца жыхарства дзіцяці вызначаецца па двухбаковай згодзе бацькоў. Пры адсутнасці згоды паміж бацькамі, спрэчку пра тое, з кім будзе пражываць дзіця, вырашае суд, зыходзячы з інтарэсаў дзіцяці і з улікам яго жадання.

**Чытачоў «Звязды» кансультуе загадчык першай Мінскай гарадской дзяржаўнай натарыяльнай канторы Святлана ГУРЫНОВІЧ.**
**Падрыхтаваў Сяргей РАСОЛЬКА.**

## УЗГАНАРОДА ЗА СМЕЛАСЦЬ

**31 сакавіка ў Быхаве граматамі і каштоўнымі падарункамі ўзнагародзілі 18-гадовую Наталлю Каламоец з вёскі Лудчыцы, якая выратавала чалавека на пажары.**

7 сакавіка яна ўбачыла пажар ў прыватным доме. Гаспадар напярэдадні пахаваў сваяка, памянуў яго, вярнуўся дадому, запаліў цыгарэту, лёг спаць і... апрытомнеў толькі ў бальніцы. Наталля — адзіная з аднавяскоўцаў, якія назіралі за пажарам, — кінулася ў ахопленую агнём хату і выцягнула 40-гадовага мужчыну. Дзяўчына атрымала грамату Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. Магілёўскае абласное ўпраўленне МНС падарыла ёй музычны цэнтр. Быхаўскі райвыканкам узнагародзіў Наталлю граматай і грашовай прэміяй.

**Ілона ІВАНОВА.**

## Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 191

### Аб звальненні ў запас ваеннаслужачых тэрміновай ваеннай службы і рэзервістаў, якія выслужылі ўстаноўленыя тэрміны ваеннай службы па прызыву, службы ў рэзерве, і прызыве грамадзян на тэрміновую ваенную службу, службу ў рэзерве ў красавіку—верасні 2008 г.

***(Вынятка)***

1. Звольніць у запас ваеннаслужачых тэрміновай ваеннай службы і рэзервістаў, якія выслужылі ўстаноўленыя тэрміны ваеннай службы па прызыву, службы ў рэзерве.

2. Прызваць у красавіку—верасні 2008 г. на тэрміновую ваенную службу, службу ў рэзерве грамадзян Рэспублікі Беларусь мужчынскага полу, якім да дня прызыву споўнілася 18 гадоў і якія не маюць права на адтэрміноўку ад прызыву, а таксама грамадзян прызыўнога ўзросту, якія страцілі права на адтэрміноўку.

3. Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь, абласным, Мінскаму гарадскому выканаўчым камітэтам забяспечыць выкананне мерапрыемстваў, звязаных з прызывам грамадзян на тэрміновую ваенную службу, службу ў рэзерве, у адпаведнасці з заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.

4. Міністэрству абароны да 30 верасня 2008 г. накіраваць прызваных на тэрміновую ваенную службу, службу ў рэзерве грамадзян ва Узброеныя Сілы, іншыя войскі і воінскія фарміраванні Рэспублікі Беларусь у межах колькасці згодна з дадаткам*.

5. Устанавіць, што пацярпелыя ад наступстваў катастрофы на Чарнобыльскай АЭС грамадзяне, прызваныя на тэрміновую ваенную службу, накіроўваюцца ў воінскія часці і фарміраванні, якія не знаходзяцца на радыеактыўна забруджаных тэрыторыях, і назначаюцца на воінскія пасады, не звязаныя з работамі па эксплуатацыі крыніц іанізуючага выпрамянення, звышвысокіх частот і работамі з кампанентамі ракетнага паліва.

6. Беларускай чыгунцы забяспечыць па заяўках Міністэрства абароны, іншых дзяржаўных органаў, у якіх прадугледжана ваенная служба, перавозку ваеннаслужачых тэрміновай ваеннай службы і рэзервістаў, якія выслужылі ўстаноўленыя тэрміны ваеннай службы па прызыву, службы ў рэзерве, і грамадзян, прызваных на тэрміновую ваенную службу, службу ў рэзерве.

7. Ваенным камісарам на падставе адпаведных рашэнняў раённых (гарадскіх) прызыўных камісій накіроўваць у органы пракуратуры матэрыялы на грамадзян, якія ўхіліліся ад прызыву на тэрміновую ваенную службу, службу ў рэзерве, для прыцягнення іх да адказнасці ў адпаведнасці з заканадаўчымі актамі Рэспублікі Беларусь.

8. Савету Міністраў Рэспублікі Беларусь да 20 лістапада 2008 г. прадставіць Прэзідэнту Рэспублікі Беларусь інфармацыю аб выніках прызыву грамадзян на тэрміновую ваенную службу, службу ў рэзерве.

9. Гэты Указ уступае ў сілу з дня яго афіцыйнага апублікавання.

**Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. ЛУКАШЭНКА.**

*31 сакавіка 2008 г.*
*г. Мінск.*

* *Для службовага карыстання.*

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### У КІЕВЕ БУШУ НЕ РАДЫ

**Распачаўся двухдзённы візіт прэзідэнта ЗША Джорджа Буша ва Украіну. У Кіеве прынятыя беспрэцэдэнтныя меры бяспекі: парадак у горадзе забяспечваюць каля пяці тысяч міліцыянераў і вайскоўцаў унутраных войскаў МУС, а ахове Буша дазволена страляць на паражэнне.**



Галоўная тэма візіту — перспектывы членства Украіны ў НАТА. Дзеля Буша, які абяцае пераканаць партнёраў па НАТА, што Украіна гатовая далучыцца да Плана дзеянняў па ўступленні ў Альянс, горад фактычна пераводзяць на асаднае становішча. Праціўнікі членства краіны ў НАТА сустрэлі Буша плакатамі: «Yankee go home» і «Fuck Bush».

Жыхары будуць пазбаўленыя магчымасці праехаць па цэнтры горада. Супрацоўнікі МУС адкрыта заклікалі кіяўлян не выходзіць на балконы, пакуль у Кіеве будзе знаходзіцца цэль № 1 для тэрарыстаў усіх масцяў. «І ужо тым больш не варта накіроўваць на высокага госця подзорную трубу або што-небудзь яшчэ даўгамернае», — піша «Газета па-кіеўску», тлумачачы, што спецслужбы прэзідэнта ЗША могуць і падстрэліць «чалавека, які выйшаў на балкон, напрыклад, пераставіць лыжы».

### БОЛЬШ ЗА ЧВЭРЦЬ ЯПОНЦАЎ НЕ ВЫКОНВАЮЦЬ ШЛЮБНЫХ АБАВЯЗКАЎ

**Больш за чвэрць жанатых пар у Японіі не займаліся сэксам на працягу многіх гадоў. Такія даныя былі апублікаваныя ў нядаўняй справаздачы Сусветнай арганізацыі аховы здароўя.**

Чым старэйшымі становяцца японцы, тым менш іх цікавіць сэксуальнае жыццё. Каля 42 працэнтаў сем'яў, дзе абодва сужэнцы знаходзяцца ва ўзросце ад 20 да 30 гадоў і пражылі разам не меней за 5 гадоў, займаюцца сэксам не радзей за адзін раз на тыдзень. У пяцідзесяцігадовым узросце амаль 38 працэнтаў жанатых японцаў наогул не маюць сэксуальных кантактаў. Каля 20 працэнтаў мужоў і 15 працэнтаў жонак у Японіі нежаданне займацца сэксам тлумачаць тым, што ім надакучыла іх другая палавіна. 15 працэнтаў жанатых мужчын кажуць, што сэкс ім не ў радасць, бо яны занадта стамляюцца на працы.

Як сведчаць вынікі даследавання, жыхар Японіі, у сярэднім, займаецца сэксам каля 45 разоў у год. Гэтая лічба істотна ніжэйшая за агульнасусветны паказчык — 103 разы ў год.

## БЕЛАРУСЬ СКАРАЧАЕ ПЕРСАНАЛ ПАСОЛЬСТВА Ў ВАШЫНГТОНЕ

**Учора ў Міністэрства замежных спраў быў запрошаны Часовы Паверамы ў справах Злучаных Штатаў Амерыкі ў Рэспубліцы Беларусь Джонатан Мур. Як паведамілі карэспандэнту БЕЛТА ў знешнепалітычным ведамстве, амерыканскаму прадстаўніку была ўручана афіцыйная нота МЗС Рэспублікі Беларусь.**

У ноце да ведама ЗША даводзіцца, што ў сувязі з неаднаразовай адмовай амерыканскага боку адмяніць дадатковыя абмежавальныя меры эканамічнага характару ў адносінах да канцэрна «Белнафтахім», а таксама з прычыны працягвання палітыкі адміністрацыі ЗША на згортванне кантактаў з беларускім бокам, Рэспублікай Беларусь прынята рашэнне аб дадатковым скарачэнні персаналу свайго пасольства ў Вашынгтоне. У адпаведнасці з артыкулам 11 Венскай канвенцыі аб дыпламатычных зносінах амерыканскаму боку прапанавана скараціць колькасць персаналу пасольства ЗША ў Мінску ў такой жа колькасці і ў адпаведныя тэрміны.

## ДА ВЕДАМА ЧЛЕНАЎ САВЕТА РЭСПУБЛІКІ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СХОДУ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

2 красавіка 2008 г. у 10.00 у зале пасяджэнняў Савета Рэспублікі (вул. Чырвонаармейская, 4) пачне работу дзесятая сесія Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь трэцяга склікання.

**КУП «Минский областной центр учета недвижимости» проводит открытый аукцион**

по продаже бетонно-растворного узла (общ. пл. 706 кв.м) и устройства для выгрузки цемента, расположенных: г. Борисов, ул. Демина, 13. Площадь земельного участка — 0, 2341 га. Начальная цена снижена на 20 % и составляет 130 000 000 бел. руб с НДС. Подробное извещение опубликовано в газете «Звязда» от 08.02.2008 г. **Аукцион состоится 15.04.2008 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 321.** Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 14.04.2008 г. до 17.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, к. 326.

**Контактный телефон (8017) 2246134.**
**Сайт в Интернете: www.rlt.by**

КУП «Минский областной центр учета недвижимости», УНП 690324015.

**КУРСЫ ВАЛЮТ**

*Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 01.04.2008 г. (для бн разлікаў)*

| | |
|---|---|
| 1 долар ЗША | 2 145,00 |
| 1 еўра | 3 390,28 |
| 1 латвійскі лат | 4 855,69 |
| 1 літоўскі літ | 981,33 |
| 1 чэшская крона | 133,85 |
| 1 польскі злоты | 961,58 |
| 1 расійскі рубель | 91,27 |
| 1 украінская грыўня | 429,00 |

*Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрабанк РФ*

| | |
|---|---|
| USD | 23,5027 |
| 10 UAH | 46,6203 |
| 1000 BYR | 10,9442 |
| EUR | 37,0873 |

*Курс у гандлёвых кампаніях на 31.03.2008 г. (USD)*: 2135 / 2210

Агенцтва Уладзіміра Грайцова

*Падпісвайцеся на часопіс «Главный бухгалтер. ГБ» на 2008 год у рэдакцыі па самай выгаднай цане. Тэлефон рэдакцыі: 209-69-01.*
*ААТ «Агенцтва Уладзіміра Грайцова» УНП 100024047 Ліцэнзія Мінсувязі № 02140/0172806 выд. 03.05.2004 да 02.05.2009*

ISSN 1990 - 763X

**РОЗГАЛАС** — АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

### ПАЧАТАК КРАСАВІКА ПАРАДУЕ САПРАЎДНЫМ ЦЯПЛОМ

**У першы дзень красавіка надвор'е яшчэ будзе вызначаць антыцыклон, які ў мінулыя выхадныя прынёс да нас істотнае пацяпленне, — паведаміў рэдакцыі начальнік службы гідраметэапрагнозаў Рэспубліканскага гідраметцэнтра Дзмітрый Рабаў.**

Аднак ужо з другой паловы дня аўторка з боку Чорнага мора ў Беларусь пачнуць паступаць больш вільготныя паветраныя масы. У гэты дзень ападкаў не прадбачыцца, толькі ў Гомельскай і Магілёўскай абласцях магчымыя невялікія дажджы.

Пачынаючы з серады і на працягу ўсяго тыдня марское паветра павялічыць воблачнасць і выклікае паўсюдна ў краіне кароткачасовыя дажджы. Разам з тым такі характар надвор'я павялічыць тэмпературу паветра ўначы, пасля чаго сярэднясутачная тэмпература першай дэкады красавіка стане на 3—5 градусаў вышэй за норму. Такім чынам, на працягу тыдня тэмпература паветра ўначы ўсталюецца ў межах плюс 1—7 градусаў, удзень — 7—13 цяпла.

**Сяргей КУРКАЧ.**

### ПТУШКУ ЗАГУБІЎ АГОНЬ

**У пажары ў вёсцы Паперня Мінскага раёна загінула больш за 52 тысячы галоў птушкі.**

Як удакладніла карэспандэнту «Звязды» прэс-сакратар Мінскага абласнога ўпраўлення МНС Анастасія Клебан, у нядзелю вечарам пажар адбыўся на тэрыторыі Першай Мінскай птушкафабрыкі. Паведамленне аб здарэнні паступіла выратавальнікам а восьмай гадзіне: занепакоеныя мясцовыя жыхары, у прыватнасці, праінфармавалі аб тым, што з боку будынкаў птушкафабрыкі бачна зарыва. Калі агняборцы прыбылі на месца, адзін з птушнікаў быў ужо ахоплены полымем, абваліўся дах будынка. Між іншым, урон мог быць куды большым, калі б не намаганні супрацоўнікаў падраздзяленняў па надзвычайных сітуацыях: выратавальнікам удалося не дапусціць агонь на суседнія тры птушнікі, дзе налічваецца каля 200 тысяч галоў птушкі. Што стала прычынай загарання? — дакладны адказ на гэтае пытанне павінны даць эксперты, якія працуюць на месцы здарэння. Цяпер разглядаецца некалькі версій прычын пажару, сярод якіх — кароткае замыканне і неасцярожнасць з агнём. Як адзначаюць у МНС, званок аб пажары паступіў вельмі позна, а вартаўнік аб загаранні наогул не паведамляў.

**Ігар ГРЫШЫН.**

### СВАВОЛЬСТВА ПРЫВЯЛО ДА БЯДЫ

**Напрыканцы мінулага тыдня дзве падобныя трагедыі здарыліся ў Капыльскім і Воранаўскім раёнах. Ахвярамі сталі чацвёра дзетак.**

У пятніцу позна ўвечары ў вёсцы Андрэеўшчына Капыльскага раёна запалаў дом мясцовай 27-гадовай жыхаркі, якая знаходзіцца ў дэкрэтным водпуску па догляду дзіцяці. З агню не змаглі выбрацца і загінулі двухгадовы хлопчык і сямігадовая дачка гаспадыні. А ў нядзелю каля трох гадзін дня пажар у вёсцы Сурконты Воранаўскага раёна забраў жыцці трохгадовага хлопчыка і яго паўтарагадовай сястры: агонь узнік у доме 23-гадовай жанчыны, якая таксама знаходзіцца ў водпуску па догляду дзіцяці. І ў першым, і ў другім выпадках, паводле папярэдняй інфармацыі, прычынай загарання стала дзіцячае свавольства з агнём.

**Ігар ГРЫШЫН.**

ГОДОВОЙ ОТЧЕТ ЭМИТЕНТА ЦЕННЫХ БУМАГ

**ОАО «ПИВЗАВОД ОЛИВАРИЯ» ЗА 2007 ГОД**

*220002, г. Минск, ул. Киселева, 30*

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 января 2008 г.**

*(в млн руб.)*

| АКТИВ | Код стр. | На начало периода | На конец периода |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| I. Внеоборотные активы | 190 | 43 370 | 60 978 |
| II. Оборотные активы | 290 | 44 027 | 32 904 |
| БАЛАНС | 390 | 87 397 | 93 882 |
| **ПАССИВ** | **Код стр.** | **На начало периода** | **На конец периода** |
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| III. Капитал и резервы | 490 | 66 407 | 69 496 |
| IV. Обязательства | 590 | 20 990 | 24 386 |
| БАЛАНС | 600 | 87 397 | 93 882 |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ на 1 января 2008 г.**

| Наименование показателя | Код стр. | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 |
| **I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 010 | **83 114** | **65 724** |
| Налоги, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ услуг | 011 | 21 160 | 16 101 |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за минусом НДС, акцизов и иных аналогичных обязательных платежей) | 020 | **61 954** | **49 623** |
| Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг | 030 | 43 978 | 36 878 |
| Расходы на реализацию | 050 | 12 379 | 7 841 |
| **Прибыль (убыток) от реализации** | 060 | **5 597** | **4 904** |
| **II. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | | |
| Операционные доходы | 070 | 25 956 | 8 265 |
| Налоги, включаемые в операционные доходы | 071 | 110 | 348 |
| Операционные доходы (за минусом НДС, иных аналогичных обязательных платежей) | 080 | 25 846 | 7 917 |
| Операционные расходы | 090 | 26 145 | 7 888 |
| **Прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов** | 120 | **-299** | **29** |
| **III. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | | |
| Внереализационные доходы | 130 | 891 | 879 |
| Налоги, включаемые во внереализационные доходы | 131 | 39 | 15 |
| Внереализационные доходы (за минусом НДС, иных аналогичных обязательных платежей) | 140 | 852 | 864 |
| Внереализационные расходы | 150 | 4 806 | 2 680 |
| **Прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов** | 160 | **-3 954** | **-1 816** |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) ЗА ОТЧЕТНЫЙ ПЕРИОД** | 200 | **1 344** | **3 117** |
| Налоги и сборы, производимые из прибыли | 210 | 2 462 | 1 889 |
| Прочие расходы и платежи из прибыли | 220 | 867 | |
| **ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) К РАСПРЕДЕЛЕНИЮ** | 240 | **-1 985** | **1 228** |

1. Количество акционеров — всего **495**, в том числе юридических лиц — **2** физических лиц — **493**

2. Информация о дивидендах и акциях:

| Наименование показателя | Единица измерения | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде | миллионов рублей | — | 158 |
| Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги) | рублей | — | 1840 |
| Обеспеченность акции имуществом Общества | тысяч рублей | 717 | 717 |
| Количество простых акций, находящихся на балансе Общества | штук | 122371 | 85660 |

7. Информация о задолженности

| | | | |
|---|---|---|---|
| Просроченная дебиторская задолженность | миллионов рублей | 388 | 638 |
| Просроченная кредиторская задолженность | миллионов рублей | — | — |

9. Среднесписочная численность работающих (человек) **531**

**Руководитель** — **Семак В.В.**
**Главный бухгалтер** — **Кучерова И.И.**

УНП 100128525

## Прэзідэнт Беларусі павіншаваў А. Лісоўскага і В. Кірыенку з заваяваннем залатых медалёў

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 29 сакавіка накіраваў тэлеграму членам нацыянальнай каманды Беларусі па веласпорту Аляксандру Лісоўскаму і Васілю Кірыенку, у якой павіншаваў іх з заваяваннем залатых медалёў на чэмпіянаце свету. «Дзякуй вам за гэтыя цудоўныя выступленні, якія парадавалі шматлікіх балельшчыкаў Беларусі. Дзякуй за высокае спартыўнае майстэрства і волю да перамогі».

## Словы падтрымкі Наталлі Цылінскай

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэна накіраваў словы падтрымкі члену нацыянальнай каманды Беларусі па веласпорту Наталлі Цылінскай, якую спасцігла траўма на сусветным першынстве ў Вялікабрытаніі. «Веру ў твой мужны характар і жадаю хутчэйшага выздараўлення», — падкрэсліваецца ў тэлеграме.

**Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.**

## Нацбанк купляе камяні

**Як паведамляла ўжо «Звязда», галоўны банк планаваў у першым квартале гэтага года прыступіць да зваротнага выкупу атэставаных брыльянтаў. І вось, як паведамілі карэспандэнту «Звязды» ва ўпраўленні інфармацыі Нацбанка, з учарашняга дня гэтыя планы рэалізаваны ў жыццё.**

Ажыццяўляецца купля брыльянтаў будзе ў апошні панядзелак кожнага месяца ў Галоўным упраўленні Нацбанка па горадзе Мінску і Мінскай вобласці, якое размешчана ў сталіцы на вуліцы Талстога, 6. Прычым да зваротнага выкупу будуць прымацца толькі атэставаныя каштоўныя камяні: брыльянты павінны мець атэстат якасці і знаходзіцца ў спецыяльнай упакоўцы, цэласнасць якой не парушана.

Між іншым, «дабро» на куплю брыльянта будзе даваць камісія Нацбанка, якая не толькі павінна пацвердзіць адпаведнасць якасна-колеравых характарыстык атэставаных брыльянтаў, але і фактычна зверыць атрыманы ад кліента атэстат якасці на каштоўны камень з копіяй аналагічнага дакумента, што захоўваецца ў галоўным банку. У тым выпадку, калі па выніках праведзенай працы ў камісіі ўзнікнуць сумненні ў сапраўднасці брыльянта, атэстата якасці на яго альбо сапраўднасці ўпакоўкі, то камень не будзе набывацца. У Нацбанку адзначаюць, што з моманту пачатку правядзення работ па пацвярджэнні якасна-колеравых характарыстык атэставаны брыльянт кліенту не вяртаецца. Зразумела, што гэта правіла не датычыцца тых выпадкаў, калі камісія дае адмоўнае заключэнне аб куплі атэставанага брыльянта.

**Ігар ГРЫШЫН.**

### БАЛЕЛЬШЧЫКІ ЗА СКАРАЧЭННЕ «ВЫШКІ»

У выніку тэлефоннага апытання, якое праводзіла асацыяцыя «Беларуская федерацыя футбола», за 16 камандаў было атрымана 1755 галасоў (35,5 %), за 12 камандаў у 2 этапы — 3191 голас (64,5%). Незразумела толькі, чаму ў апытанні адсутнічае варыянт з 14 клубамі, каб рэфармаванне вышэйшай лігі адбывалася паступова.

## ИНФОРМАЦИЯ О РЕЗУЛЬТАТАХ ФИНАНСОВО-ХОЗЯЙСТВЕННОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ ОАО «Брестский радиотехнический завод» за 2007 г.

*224023 г. Брест, ул. Московская, 248, тел. (0162) 41 09 84, факс (0162) 42 51 59*

***Основные виды деятельности**: производство электронно-вычислительных машин и другого оборудования для обработки информации*

### Бухгалтерский баланс на 1 января 2008 г.

*(млн руб.)*

| Актив | Код стр. | На начало отчетного года | На конец отчетного периода |
|---|---|---|---|
| **I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Основные средства | 110 | 2 099 | 2 253 |
| Нематериальные активы | 120 | 1 | 1 |
| Доходные вложения в материальные ценности | 130 | — | — |
| Вложения во внеоборотные активы | 140 | 127 | 29 |
| Прочие внеоборотные активы | 150 | — | — |
| **ИТОГО по разделу I** | 190 | 2 227 | 2 283 |
| **II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ** | | | |
| Запасы и затраты | 210 | 800 | 965 |
| Налоги по приобретенным активам | 220 | 37 | 1 |
| Дебиторская задолженность | 230 | 58 | 389 |
| Расчеты с учредителями | 240 | — | — |
| Денежные средства | 250 | 356 | 176 |
| Финансовые вложения | 260 | 2 | 2 |
| Прочие оборотные активы | 270 | — | — |
| **ИТОГО по разделу II** | 290 | 1 253 | 1 533 |
| **БАЛАНС** | 300 | 3 480 | 3 816 |
| **Пассив** | **Код строки** | **На начало отчетного года** | **На конец отчетного периода** |
| **III. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ** | | | |
| Уставный фонд | 410 | 2 375 | 2 375 |
| Резервный фонд | 420 | 3 | 51 |
| Добавочный фонд | 430 | 755 | 1 013 |
| Прибыль (убыток) отчетного года | 440 | — | — |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 450 | -220 | -112 |
| Целевое финансирование | 460 | — | — |
| Доходы будущих периодов | 470 | 19 | 19 |
| **ИТОГО по разделу III** | 490 | 2 932 | 3 346 |
| **IV. ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | — | — |
| Краткосрочные кредиты и займы | 520 | — | — |
| Кредиторская задолженность | 530 | 548 | 457 |
| Задолженность перед учредителями | 540 | — | 13 |
| Резервы предстоящих расходов | 550 | — | — |
| Прочие виды обязательств | 560 | — | — |
| **ИТОГО по разделу IV** | 590 | 548 | 470 |
| **БАЛАНС** | 600 | 3 480 | 3 816 |

### Отчет о прыбылях и убытках за 2007 г.

| Наименование показателей | Код стр. | За отчетный период | За аналогичный период прошлого года |
|---|---|---|---|
| **I. ДОХОДЫ И РАСХОДЫ ПО ВИДАМ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ** | | | |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 010 | 6 039 | 4 256 |
| Налоги, включаемые в выручку от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 011 | 965 | 633 |
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг (за вычетом налогов и сборов, включаемых в выручку) | 020 | 5 074 | 3 623 |
| Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг | 030 | 4 297 | 3 052 |
| Управленческие расходы | 040 | 681 | 774 |
| Расходы на реализацию | 050 | 73 | 65 |
| Прибыль (убыток) от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 060 | 23 | -268 |
| **II. ОПЕРАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | | |
| Операционные доходы | 070 | 684 | 516 |
| Налоги, включаемые в операционные доходы | 071 | 108 | 66 |
| Операционные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых в операционные доходы) | 080 | 576 | 450 |
| Операционные расходы | 090 | 193 | 323 |
| Прибыль (убыток) от совместной деятельности | 100 | — | — |
| Доходы (потери) от участия в уставных фондах других организаций | 110 | — | — |
| Прибыль (убыток) от операционных доходов и расходов | 120 | 383 | 127 |
| **III. ВНЕРЕАЛИЗАЦИОННЫЕ ДОХОДЫ И РАСХОДЫ** | | | |
| Внереализационные доходы | 130 | 11 | 11 |
| Налоги и сборы, включаемые во внереализационные доходы | 131 | 1 | 1 |
| Внереализационные доходы (за вычетом налогов и сборов, включаемых во внереализационные доходы) | 140 | 10 | 10 |
| Внереализационные расходы | 150 | 91 | 66 |
| Прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов | 160 | -81 | -56 |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 200 | 325 | -197 |
| Налоги, сборы и платежи из прибыли | 210 | 139 | 21 |
| Прочие расходы и платежи из прибыли | 220 | 17 | 29 |
| ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 240 | 169 | -247 |

Обеспеченность акции имуществом Общества — 8 402 руб.

Количество акционеров всего — 883, в том числе юридических лиц — 1, физических лиц — 882.

Среднесписочная численность работающих — 163 чел.

Собрание акционеров проведено — 27 марта 2008 г.

Установлен размер дивидендов по итогам работы за 2007 год на одну акцию в сумме 33,06 рубля.

Решением общего собрания акционеров ОАО «Брестский радиотехнический завод» установлены следующие сроки выплаты дивидендов за 2007 год:

— I этап — дивиденды на акции, принадлежащие Республике Беларусь, Брестскому областному территориальному фонду государственного имущества, Брестскому ГИК перечислить в республиканский, областной и городской бюджеты до 1 мая 2008 г.;

— II этап — акционерам — работникам Общества, сторонним акционерам — физическим лицам с 1 мая 2008 г. по 1 августа 2008 г.

Порядок выплаты дивидендов:

— акционерам — работникам Общества — в кассе Общества;

— сторонним акционерам — физическим лицам при сумме дивидендов за вычетом подоходного налога больше суммы минимального почтового перевода (200 рублей) путем почтового перевода или в кассе Общества, при сумме дивидендов за вычетом подоходного налога меньше суммы минимального почтового перевода (200 рублей) — в кассе Общества или депонировать.

**Директор** **Е.Н. Тромза**

**Главный бухгалтер** **И.В. Ярмак**

УНП 200273907

# Пацалункі Цудатворцу

**Бабруйскія праваслаўныя вернікі просяць у Свяціцеля Мікалая Крупіцкага здароўя і ўдачы.**

У мінулыя выхадныя дні ў Свята-Мікола-Сафійскім храме было шмат людзей. Прыхаджане ішлі пакланіцца цудатворнаму абразу, які прывезлі з Украіны. Суправаджаюць праваслаўную каштоўнасць манашкі са Свята-Мікалаеўскага Батурынскага манастыра, што ў Чарнігаўскай вобласці.

Паводле падання, абраз Святога Мікалая быў яўлены на кургане паблізу Канатопа, і там сталі сяліцца манахі. Першы цуд адбыўся ў час татарскай аблогі. У манастыры скончыліся харчы, але пасля малітвы перад абразам з'явілася воблака, з якога пасыпалася крупа — манна нябесная. Гэта падзея дала адметную назву абразу Святога Мікалая.

За савецкім часам манастыр быў разрабаваны. Калі разбуралі будынкі, жанчыне ўдалося схаваць цудатворны абраз, уратаваць яго ад знішчэння. І пасля 70 гадоў блукання па гарышчах і падполах выява Свяціцеля Мікалая была вернута адроджанаму манастыру.

Цяпер праваслаўная святыня знаходзіцца ў Бабруйску. На працягу 21 дня яна будзе гасцяваць у храмах горада і раёна.

Тры дні абраз Мікалая Цудатворцы знаходзіўся ў Свята-Мікола-Сафійскай царкве. У гэтага бабруйскага храма — невялікага, утульнага, нават хатняга — незвычайная гісторыя.

— Так, тут калісьці і быў святарскі дом, — расказаў айцец Віктар. — З прыходам савецкай улады галоўны храм горада зачынілі, а апошнюю царкву на могілках падпалілі. Калі прыехалі пажарныя, то яны тушылі агонь на дрэвах і навакольнай тэрыторыі, а не ратавалі царкву. Тут не абышлося без умяшання тагачасных уладаў, якія хацелі, каб вернікі засталіся без храма. І тады айцец Валянцін аддаў пад гэта сваю хату.

Вялікі абраз Свяціцеля Мікалая Крупіцкага выстаўляўся ў цэнтры храма. У полымі шматлікіх свечак блішчэла пазалота. З абраза, які датуецца XVII стагоддзем, сівавалосы святы з мудрымі вачыма бласлаўляе людзей.

Вернікі ішлі ў царкву ад раніцы да позняга вечара. Яны разглядалі абраз, набывалі ў манашак рэпрадукцыі, станавіліся ў невялікую чаргу і падыходзілі. Пра сябе выказвалі просьбу да Святога Мікалая Цудатворцы і цалавалі яго выяву. Шкло, якім пакрыты абраз, пасля кожнага пацалунка працірала жанчына.

— Каб чыста было, — тлумачыць яна паміж справай. — Тут ужо тысячы людзей прайшлі. Днямі ўпала жанчына і білася: казалі, што Цудатворца бесаў прагнаў. А найбольш ідуць да абраза маладыя сем'і. Цалуюць абраз і мужчыны, і маці падносяць да яго сваіх дзяцей.

Святую карціну ўпрыгожваюць праваслаўныя крыжы і медальёны на ланцугах. Збоку і ўнізе ў металічным аздабленні знаходзяцца мошчы святога. Менавіта да іх вернікі прыкладаюць рэпрадукцыю, каб прынесці дадому частку цудатворнай сілы старажытнага абраза. Тут жа вісіць і залаты ланцужок з пярсцёнкам. Кажуць, што такім чынам упрыгожыў абраз святар аднаго з бабруйскіх храмаў. Гэта ўдзячнасць вернікаў за дапамогу Святога Мікалая. Аднак якую канкрэтна дапамогу — невядома.

Многія вернікі проста гавораць, што прасілі Цудатворцу пра асабістае.

— Гэта сапраўды асабістая справа: кожны прыходзіць са сваімі праблемамі, — кажа Сяргей. — І я не сумняваюся ў цудзе. Прыйшоў сюды па вокліку сэрца і душы...

**Ілона ІВАНОВА.**

*г. Бабруйск*

## Абзац

■ Больш за 10 тыс. вярблюдаў з усіх канцоў Персідскага заліва прыбываюць у Абу Дабі для ўдзелу ў конкурсе на званне самага прыгожага «карабля пустыні». Вярблюды з Бахрэйна, Кувейта, Амана, Катара і Саудаўскай Аравіі паўстануць перад журы экспертаў, якія выберуць пераможцу. Гаспадар «самага прыгожага» атрымае галоўны прыз у памеры каля 9,5 млн долараў. Таксама ў якасці прызоў удзельнікам раздадуць 100 аўтамабіляў.

■ **Афіцыйны прадстаўнік Рымска-каталіцкай царквы ў Нью-Йорку заявіў, што святар прыхода ў горадзе Уайт-Плэйнс, прыгарадзе Нью-Йорка, падазраецца ў растраце царкоўных грошай. Патрыка Дана, які ўзяў з царкоўнай касы значную суму грошай і, як мяркуецца, патраціў іх на азартныя гульні, назаўсёды адхілілі ад працы з вернікамі.**

■ У Маскоўскай вобласці ў пасёлку Багародскае 20-гадовы ахоўнік прадпрыемства і 14-гадовая школьніца скончылі жыццё самагубствам з-за непаразумення родных. Маладыя людзі скокнулі з верхняй пляцоўкі вышкі мабільнай сувязі. Паводле папярэдняга расследавання, закаханыя рашыліся на такі адчайны крок таму, што сям'я дзяўчыны была супраць адносінаў маладых людзей з-за розніцы ва ўзросце. Закаханыя памерлі на месцы.

| Прибыль (убыток) от внереализационных доходов и расходов (140-150) | 160 | -236 |
| ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК)(060-/-120+/-160) | 200 | 1 086 |
| Налоги и сборы из прибыли | 210 | 477 |
| Прочие расходы и платежи из прибыли | 220 | 4 |
| ЧИСТАЯ ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) (200-210-220) | 240 | 605 |
| Справочно (из строки 240): сумма предоставленной льготы по налогу на прибыль | 250 | — |
| количество организаций | 260 | 4 |
| сумма полученной ими прибыли | | 605 |
| количество организаций | 270 | — |
| сумма полученного ими убытка | | — |

## *Бухгалтерский баланс*
***по состоянию на 01.01. 2008 г.***

| Наименование показателя | Код строки | На конец отчетного периода |
|---|---|---|
| **АКТИВ** | | |
| **I. ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ** | | |
| Основные средства | 110 | 8 930 |
| Нематериальные активы | 120 | — |
| Доходные вложения в материальные ценности | 130 | — |
| Вложения во внеоборотные активы | 140 | 1 712 |
| в том числе: незавершенное строительство | 141 | 1 709 |
| Прочие внеоборотные активы | 150 | — |
| ИТОГО по разделу I | 190 | 10 642 |
| **II. ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ** | | |
| Запасы и затраты | 210 | 560 |
| в том числе: сырье, материалы и др. активы | 211 | 90 |
| незавершенное производство и полуфабрикаты | 213 | — |
| расходы на реализацию | 214 | — |
| готовая продукция и товары для реализации | 215 | 157 |
| товары отгруженные | 216 | 281 |
| расходы будущих периодов | 218 | 32 |
| Налоги по приобретенным активам | 220 | 7 |
| Дебиторская задолженность | 230 | 317 |
| в том числе: покупателей и заказчиков | 231 | 33 |
| поставщиков и подрядчиков | 232 | 208 |
| разных дебиторов | 233 | 59 |
| прочая дебиторская задолженность | 234 | 17 |
| Расчеты с учредителями | 240 | — |
| в том числе: по вкладам в уставный фонд | 241 | — |
| прочие | 242 | — |
| Денежные средства | 250 | 1 308 |
| в том числе: денежные средства на депозитных счетах | 251 | 996 |
| Финансовые вложения | 260 | 657 |
| Прочие оборотные активы | 270 | 27 |
| ИТОГО по разделу II | 290 | 2 876 |
| **БАЛАНС** | **300** | **13 518** |
| **ПАССИВ** | | |
| **III. КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ** | | |
| Уставный фонд | 410 | 280 |
| Собственные акции (доли), выкупленные у акционеров (учредителей) | 411 | — |
| Резервный фонд | 420 | — |
| Добавочный фонд | 430 | 12 783 |
| Прибыль (убыток) отчетного периода | 440 | — |
| Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток) | 450 | 366 |
| Целевое финансирование | 460 | — |
| Доходы будущих периодов | 470 | — |
| ИТОГО по разделу III | 490 | 13 429 |
| **IV. ОБЯЗАТЕЛЬСТВА** | | |
| Долгосрочные кредиты и займы | 510 | — |
| Краткосрочные кредиты и займы | 520 | — |
| Кредиторская задолженность | 530 | 76 |
| в том числе: перед поставщиками и подрядчиками | 531 | 16 |
| перед покупателями и заказчиками | 532 | 4 |
| по оплате труда | 533 | 14 |
| по расчетам с персоналом | 534 | — |
| по налогам и сборам | 535 | 28 |
| по социальному страхованию и обеспечению | 536 | 5 |
| разных кредиторов | 537 | 9 |
| прочая кредиторская задолженность | 538 | — |
| Задолженность перед учредителями | 540 | 11 |
| в том числе: по выплате доходов, дивидендов | 541 | 11 |
| прочая | 542 | — |
| Резервы предстоящих расходов | 550 | 2 |
| Прочие виды обязательств | 560 | — |
| ИТОГО по разделу IV | 590 | 89 |
| **БАЛАНС** | **600** | **13 518** |
| Справочно (из строки 530): долгосрочная кредиторская задолженность | 601 | — |
| краткосрочная кредиторская задолженность | 602 | 76 |

Получены аудиторские заключения по бухгалтерской (финансовой) отчетности ОАО «Актамир» и его унитарных предприятий, согласно которым: бухгалтерская (финансовая) отчетность отражает достоверно во всех существенных отношениях их финансовое положение на 1 января 2008 года и результаты финансово-хозяйственной деятельности за 2007 год.

**Генеральный директор** **А.С. Купреев**
**Главный бухгалтер** **Л.В. Гвоздик**

УНН 100097980

## Открытое акционерное общество «Минский экспериментально-фурнитурный завод»

*Адрес: г. Минск, ул. Старовиленская, 100, т./факс: 334 96 54*

### Бухгалтерский баланс
**на 1 января 2008 года**

| Наименование статьи | в миллионах белорусских рублей |
|---|---|
| **ВНЕОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ** | |
| Основные средства | 10402 |
| Нематериальные активы | 1 |
| **ОБОРОТНЫЕ АКТИВЫ** | |
| Запасы и затраты | 3394 |
| Налоги по приобретенным ценностям | 259 |
| Дебиторская задолженность | 235 |
| Денежные средства | 93 |
| Финансовые вложения | 2 |
| **БАЛАНС** | 14386 |
| **КАПИТАЛ И РЕЗЕРВЫ** | |
| Уставный фонд | 6347 |
| Добавочный фонд | 4140 |
| Нераспределенная прибыль | -116 |
| Целевое финансирование | 21 |
| **РАСЧЕТЫ** | |
| Кредиты и займы | 1499 |
| Кредиторская задолженность | 2495 |
| **БАЛАНС** | 14386 |
| **ЧИСТЫЕ АКТИВЫ** | 10369 |

### Отчет о прибылях и убытках

| Наименование показателя | в миллионах белорусских рублей |
|---|---|
| Выручка от реализации товаров, продукции, работ, услуг | 5868 |
| Налоги, включаемые в реализацию продукции | 908 |
| Себестоимость реализованных товаров, продукции, работ, услуг | 4409 |
| Расходы на реализацию | 88 |
| Прибыль (убыток) от реализации | 463 |
| Прочие операционные доходы | 8 |
| Прочие операционные расходы | — |
| Внереализационные доходы | 26 |
| Внереализационные расходы | 51 |
| Прибыль отчетного периода | 446 |
| Налог на прибыль и иные обязательные платежи | 253 |
| Прибыль к распределению | 193 |

**Руководитель:** **Булдык Сергей Александрович**
**Главный бухгалтер:** **Гидлевская Тамара Ростиславовна**

УНП 100219829.

У сувязі з пастулпіўшай заявай аб прызнанні адсутнай без вестак **суд Ашмянскага раёна Гродзенскай вобласці** просіць грамадзян і юрыдычных асобаў на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы паведаміць суду (г. Ашмяны, вул. Савецкая, 39) вядомыя ім звесткі адносна **КУРПІЦКАЙ Рэгіны Генрыхаўны**, 1963 года нараджэння, ураджэнкі г.п. Астравец Гродзенскай вобласці, якая пражывала па адрасе: Ашмянскі раён, в. Будзёнаўка, вул. Гагарына, д. 35.

У вытворчасці **суда г. Наваполацка Віцебскай вобласці** знаходзіцца грамадзянская справа аб аб'яўленні памерлым **РУДЗЯ Уладзіміра Іванавіча**, 1967 года нараджэння, ураджэнца в. Пашкі Шаркаўшчынскага раёна Віцебскай вобласці, які пражываў у г. Наваполацку, вул. Блахіна, д. 21, секцыя 8, пакой 3—4. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра грамадзяніна У.І. Рудзя, паведаміць іх суду г. Наваполацка на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

У **суд Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці** паступіла заява аб аб'яўленні памерлай **БЕЛАЙ Наталлі Іосіфаўны**, 11 студзеня 1931 года нараджэння, ураджэнкі г. Васілевічы Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці, апошняе вядомае месца жыхарства — вул. Астроўскага, д. 20, г. Васілевічы Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра Н.І. Белую, паведаміць іх суду Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

У **суд Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці** паступіла заява аб прызнанні памерлай **ЛІПКА Ірыны Варфаламееўны**, 4 ліпеня 1965 года нараджэння, якая пайшла з дому ў 2003 годзе і месца знаходжання яе невядомае. Апошняе месца жыхарства — г. Кобрын, вул. Леніна, д.12, кв. 2. Просьба да ўсіх грамадзян і юрыдычных асобаў, якія маюць звесткі пра І. В. Ліпку, паведаміць іх суду Кобрынскага раёна Брэсцкай вобласці на працягу двух месяцаў з дня апублікавання аб'явы.

# Затрымалі ў кабінеце

**У Брэсце ў службовым кабінеце супрацоўнікамі ўпраўлення па барацьбе з эканамічнай злачыннасцю УУС была затрымана адказная асоба ААТ «Прадсэрвіс».**

Паводле папярэдняй інфармацыі, 27-гадовы брастаўчанін падазраецца ў атрыманні хабару ад намесніка дырэктара аднаго з прыватных унітарных прадпрыемстваў. Як мяркуецца, ад 35-гадовай мясцовай жыхаркі адказная асоба атрымала 1700 долараў ЗША за станоўчае вырашэнне пытання аб заключэнні дагавора-арэнды за памяшканне.

**Дзмітрый СТАНКОВІЧ.**

## Першакрасавіцкая чытанка:

**Пародыі і эпіграмы Міколы ШАБОВІЧА**
**Малюнкі Алега КАРПОВІЧА**

### ПАКІНЬ ХОЦЬ «ЛЮДЗІ НА БАЛОЦЕ»!

«Нарачанскія сосны»
«Жураўліны крык»
«Лясная песня»
(Назвы вершаў Міхася БАШЛАКОВА)

А я тут жыву, а я тут,
Дзе завеі звіяе снежань.

**Міхась БАШЛАКОЎ.**



*Ох, не пагладзяць па галоўцы,*
*Калісь наб'юць табе гузак*
*І Танк, і Мележ, і Русак*
*За ўсе, што ўзяў ты, загалоўкі.*

*І Мележ сціпшыца ў самоце:*
*— Калі бярэш, то меру знай:*
*«Завеі. Снежань» — забірай,*
*Але ж не «Людзі на балоце»!*

*Чыталі вершы вы ўначы,*
*Клубіўся дым ад цыгарэты.*
*На ранку бразнулі ключы*
*На спіну жоўтую паркету.*
*Сюжэт заезджаны амаль.*
*Фінал — бананьны і вядомы.*
*Чаго ты ўпёрся ў той «Сантраль»?*
*Грашыў бы, Толя, лепей дома!*

### ДАЧНІКІ

Ад пятніцы да панядзелка
Растуць агуркі і бульба —
Як бочачка, будзе дзеўка
І звяць, як Пятрусь Лумумба.

Не маючы з неба манны,
Зямлю разграбуць рукамі
Івана Мележа Ганны
З В. Быкава Петрукамі...

**Леанід ГАЛУБОВІЧ.**



*Ніколі ён не лайдачыў,*
*Не з племені мумба-юмба,*
*Купіў у Баярах дачу*
*Аднойчы Патрыс Лумумба.*

*Гуркі пасадзіў і бульбу,*
*Пасля памідораў градку.*
*З любоўю глядзеў Лумумба*
*На нашу зямельку-матку.*

*Ну, думаў, участак танны,*
*Дзе шуфлем, а дзе рукамі,*
*Калі б не Мележа Ганны*
*З В. Быкава Петрукамі.*

*За ноч разграблі зямельку,*
*Скапалі дашчэнту бульбу.*
*Лумумбу цяпер — бы ў пельку,*
*Без бульбы памрэ Лумумба.*

*А Лёня пачуў пра гэта —*
*Паклікаў Шніпа са Шрубам.*
*Да Ганны прыйшлі да свету*
*І ставяць пытанне рубам:*

*«Дзе бульба, кажы, не сыкай,*
*Гуркі, памідоры з клумбы?»*
*А Ганна: «Пятрук заныкаў,*
*Не ведаў ён, што Лумумбы».*

*Прыйшлі к Петруку. Ды дзе там!*
*Няма ўжо, гаворыць, бульбы.*
*Дахаты пайшлі паэты.*
*Паехаў дамоў Лумумба.*

### БАДАК-БЯДАК

Я забыў запаветныя словы,
Што зблізкалі з табою заўжды.

Штодня крычыць жанчына
Ў кватэры мне чужой...

Прыгожая суседка
З кватэры, як 02...

**Алесь БАДАК.**



*Я забыў запаветныя словы,*
*Наш з табой сэксуальны пароль,*
*І цяпер, нібы хлопчык вясковы,*
*Паўтараю ледзь чутна: «Дазволь!..»*

*Ну, а ты і не чуеш нібыта,*
*Нат плячом не вядзеш ты ані,*
*І, здаецца, няма ўжо тых нітак,*
*Зноў каб сшыць нашы ночы і дні...*

*Я б гучней папрасіў, ды баюся:*
*Шчэ прыпрэцца суседка-ўдава...*
*Лепш адзін я слязьмі захлінуся,*
*Чым з суседкай з кватэры 02.*

### РАІСЕ БАРАВІКОВАЙ

Яна й рэдактар,
і паэт,
З ёй кожны
хоча павітацца.
Напэўна, ведае
сакрэт
Усім мужчынам
падабацца.



*Калі ж які*
*загляне госць:*
*— Ну як Вам*
*наша «Мала-*
*досць»?*
*І так усмешкай прывітае —*
*Хто й не чытаў, той прачытае.*

### МАЛАЙЧЫНА, ВІЦЯ!

Ссячы, відаць, асіну трэба...
Ды штось сячы не дазваляе.

**Віктар ШНІП.**



*Аднойчы ў «ЛіМе»*
*мы замерзлі,*
*І Пісьмянкоў*
*паслаў па дровы.*
*Сябры у лес*
*мяне завезлі,*
*Хаджу адзін я*
*па дуброве.*
*Гляджу: асіна...*
*Не пад неба,*
*Але ж не надта і*
*малая.*
*Ссячы, відаць, асіну трэба,*
*Ды штось сячы не дазваляе.*

*Магчыма, тое, што танцору,*
*Ці кампазітару, магчыма...*
*І на мяне з павагай зоры*
*Глядзяць і кажуць: «Малайчына!»*

### ЧОРНЫ ТРОХКУТНІК, альбо КАБ ТРОХІ — ДЫК І МАЛЕВІЧ

Чорны трохкутнік таемны, як грэх.
Палка спакусны. Цнатлівы адвечна.
Светлы, як ранак, і цёмны, як вечар,
Мяккі, як вэлюм. Тугі, як арэх.

Танны каму, а каму дарагі
І неспазнаны той чорны трохкутнік.

**Навум ГАЛЬПЯРОВІЧ.**



*Чатыры ночы працаваў,*
*Як раб-пакутнік.*
*Чарнютка-чорны маляваў*
*Я свой трохкутнік.*

*Чарней за полацкую ноч,*
*Чарней, чым сажа.*
*Я ад яго не зводзіў воч —*
*Хай жонка скажа.*

*Хацеў я ўнесці на вякі*
*Імя ў аналы,*
*Ды не шанцуе мне, браткі,*
*Бо славы мала.*

*З фігурай, кажуць, не ўгадаў,*
*На вугал меней.*
*Зямляк квадрат намаляваў —*
*І зразу геній!*

*І ўсё ж зарана сумаваць:*
*Ёсць ручка, сціркa.*
*Што, калі ромб намаляваць*
*Ці круга дзірку?*

### НАЦЕРАБІЎСЯ

За мной цікавала заўжды дзяўчынка,
Калі я бярозам бакі церабіў.

**Мікола МЯТЛІЦКІ.**



*Калісьці я быў*
*сарамлівы*
*хлапчына,*
*Баяўся крануцца*
*дзявочай рукі.*
*У лес шкандыбаў*
*без усякай пры-*
*чыны*
*І там церабіў я*
*бярозам бакі.*
*Дзяўчаты ж за мной*
*цікавалі заўсёды.*
*Чаму цікавалі? —*
*Не знаю й цяпер.*
*Ад іх я ўцякаў*
*праз кусты і гароды,*
*Бо скажуць у вёсцы:*
*«Глядзі, кавалер!»*
*А потым ажэняць*
*яшчэ неспадзеўкі —*
*А мне шчэ жаніцца*
*было не з рукі.*
*У Мінск я прыехаў.*
*Вось там былі дзеўкі!*
*О, колькіх жа я церабіў за бакі!*

### АЎТАЭПІГРАМА



*Пісаў пра Ненаглядку —*
*быў ты лірык,*
*Пасля задумаў*
*парадыстам*
*стаць,*
*Змог нават*
*эпіграмы*
*напісаць...*
*Скажы, Мікола,*
*можа,*
*ты й сатырык?*

### ВАЯЖЫ АНАТОЛЯ ЗЭКАВА

Стамбул.
Атэль «Сантраль».
Нас у пакоі двое...

**Анатоль ЗЭКАЎ.**



*Дзе той Стамбул!*
*Дзе той «Сантраль»!*
*Ваяж няблізкі, несумнеўна.*
*Начны спакуслівы вакзал.*
*Гатэль. Дзяўчына-каралеўна.*

### АЛЕГУ КАРПОВІЧУ

*Алег! Мой дружа залаты!*
*Ты груз такі ўзваліў на плечы!*
*Ну, хто б яшчэ, калі б не ты,*
*Мой ХОР так годна ўвекавечыў!?*



# Пра сяброў-таварышаў з усмешкай

*Журналіст Вячаслаў ВОЛЬСКІ пэўны час працаваў у рэдакцыі газеты «Звязда». У яго запісной кніжцы засталіся многія анекдатычныя выпадкі з рэдакцыйнага жыцця, якія тады па розных прычынах не трапілі на старонкі газеты. Таму цяпер, у дзень гумару, мы знаёмім з імі нашых чытачоў.*

Наш ветэран-звяздовец Янка Казлоў быў аматар розных, як цяпер кажуць, прыколаў. Аднойчы ён зайшоў у аддзел прапаганды і сеў за стол Навума Львовіча Юшпраха. Перад ім ляжала пачатая карэспандэнцыя пра агітатара. Такія штучныя матэрыялы Навуму Львовічу даваліся вельмі цяжка, бо па сутнасці агітатары існавалі толькі на паперы, а іх работу Навуму даводзілася высмоктваць з пальца. І ён часта, напісаўшы пару абзацаў, ішоў курыць у канец калідора і абдумваць новы абзац. А тут Янка вырашыў «дапамагчы» Навуму. Почырк у яго быў падобны на Навумаў, мы сталі сачыняць хохму. Сэнс яе перадаю па памяці: «Касец Кузьма Сідараў закончыў свой пакос. Было ўжо апоўдні. Ён сеў пад куст у цень разам з суседам Ігнатам Ворчыкам. І толькі развязаў авоську, якую яму сабрала жонка Маланння, каб падсілкавацца, як раптам з-за куста шусь агітатар. «Ну, назола, — падумаў Кузьма. — Зноў давядзецца дзяліць чацвярцінку на траіх».

Гэты Янкаў абзац вылавіў з Навумавага артыкула толькі намеснік рэдактара.

* * *

З выступлення фатакора Міколы Амельчанкі на лятучцы. «Што мы ўвесь час хапаемся за БЕЛТАўскія здымкі. Вось падзівіцеся, што з гэтага атрымліваецца (ён паказвае «Сельскую газету» і «Звязду», дзе на першай паласе адзін і той жа белтаўскі здымак). «Бачыце: трактар «Беларус» цягне адну і тую ж бочку, прабачце, з ... і ў нас, і ў «Сельскай» таксама. (Так праводзілася ў той час падкормка пасеваў.) Мы з Антонам Сасіноўскім маглі б зрабіць іншы здымак такой падкормкі». *(Голас з залы)*: «З той жа самай бочкай? Толькі Антон бы яе цягнуў, а ты б здымаў». *(Смех у зале.)*

* * *

У загадчыка аддзела пісьмаў Рыгора Мікалаевіча Сяргеенкі было хобі. Ён вельмі любіў футбол і пісаў кароткія заметкі аб тых матчах, якія адбываліся на мінскім стадыёне «Дынама». Але аднойчы ён захацеў апярэдзіць са сваёй інфармацыяй нават спартыўную газету «Физкультурник Белоруссии». Ідучы на матч нашых футбалістаў з армейцамі Растова-на-Доне, ён аднёс у машбюро «балванку», дзе падрабязна выклаў турнірнае становішча сапернікаў і штосьці з гісторыі іх барацьбы паміж сабою, а старшую машыністку, суседку па кватэры, папрасіў, каб яна дапісала ў яго «балванку» толькі адзін сказ аб выніку матча, які ён ёй паведаміць па тэлефоне са стадыёна.

Раніцай у газеце ў канцы заметкі мы прачыталі:

«У першым тайме мінчане забілі растаўчанам адзін гол, а пасля паядынку яшчэ два мячы».

— Рыгор Мікалаевіч, чаго ж так мала мячоў мінчане забілі ў вароты растаўчанам, калі тыя пайшлі ўжо з поля? — кпілі са старога аматара футбола яго калегі, маладыя звяздоўцы. Сяргеенка толькі моўчкі махаў рукой, маўляў, адчапіцеся, перасмешнікі. А памылка ўкралася ў тэкст заметкі ад сугучнасці слоў «перапынка» — «паядынка». Іх і пераблытала машыністка.

* * *

Аддзел сельскай гаспадаркі ў нас лічыўся аўральным. З ранняй вясны і да позняй восені знаходзіўся ён і яго загадчык Аркадзь Фёдаравіч Кукарэка ў пастаянным напружанні, нягледзячы на тое, што на яго працавалі ўвесь час і ўсе абласныя карэспандэнты. Спярша сяўба, потым — жніво, а за ім — уборка бульбы. І так кожны год — аўралы. Да іх ужо прызвычаіўся Аркадзь Фёдаравіч і ў яго ўжо былі ўласныя афарызмы тыпу: раней пасеем — раней перасеем (калі вясною на ўсходы выпадаў снег з маразамі). Часта ён паўтараў і такі: сяўба — сяўбою, а абед па графіку.

Але больш за ўсё ў той час вёсцы дапякаў шэф сельскага аддзела «чырвонага дома» Шавялуха. Пра яго нават сачынілі каламбур: «Знізу мокра, зверху — суха. І кіруе Шавялуха».

* * *

Улік пісьмаў у рэдакцыі вяла і разносіла іх па аддзелах цудоўнай душы жанчына Тамара Мікалаеўна Мілейша. Гэта была рэдкая адпаведнасць яе прозвішча з рысамі яе характару. Заўсёды, калі яна заходзіла ў аддзел, з яе вуснаў зляталі словы: «Калі ласачка, вось вам падаруначак ад чытачоў!» На яе твары пастаянна свяцілася прыемная ўсмешка. Паміж сабою мы яе так і называлі: «Калі ласачка».

* * *

Пэўны час загадчыкам міжнароднага аддзела ў «Звяздзе» працаваў Віктар Плешавеня. І ў перыяд работы сесіі Генеральнай асамблеі ААН, дзе заўсёды брала ўдзел і наша, беларуская дэлегацыя, Плешавеня з раніцы заказваў па тэлефоне Нью-Йорк, а ў канцы дня спрабаваў дазваніцца туды, каб даведацца пра пэўныя падзеі і паведаміць пра іх у газеце. Але кожная яго спроба заканчвалася прыкладна так: «Нью-Йорк, дайце Нью-Йорк!» А тэлефаністка яму: « Нью-Йорк не отвечает». У роспачы Плешавеня прасіў тэлефаністку: «Ну, дайце тады Ванелівічы». (Там жыла яго цешча.)

Топ-10

# ПАЦАЛУНАК, ЗА ЯКІ КАРАЮЦЬ

### *Карэспандэнт «Звязды» склала дзесятку спартыўных кур'ёзаў*

**Спорт — гэта не толькі ачкі, галы, секунды, рэкорды, але і эмоцыі. Цяжка сказаць, якія з іх дамінуюць — радасныя ці сумныя, бо любімыя каманды то выйграюць, то прайграюць. Асабіста я думаю, што лепшы варыянт — слёзы ад смеху, таму з нагоды надыходзячага дня смеху прапаную чытачам «Звязды» ўзгадаць эпізоды, пазнаёміўшыся з якімі, хочацца ўсміхнуцца ад учынкаў спартсменаў у час матчаў і па-за гульнёй. Спадзяюся, што дзесятак спартыўных кур'ёзаў узніме вам настрой.**

**10.** Гумарыстычную дзесятку адкрывае наш зямляк і, як аказалася, чалавек з добрым пачуццём гумару Валянцін Бялькевіч. У адным з матчаў украінскага чэмпіянату футбаліст паказаў жоўтую картку свайму аднаклубніку, 19-гадоваму Дзянісу Дзядзечку. «Гарчычнік» ігрок «Дынама» знайшоў на полі. Арбітр не стаў караць жартаўніка, бо ён жа сам згубіў жоўтую картку.

**9.** Дзявятую пазіцыю заслужыла бразільская валейбалістка Жаклін Карвальё. Пасля таго, як дзяўчыну злавілі на выкарыстанні допінгу, спартсменка сказала, што забароненае рэчыва аказалася ў ...чаі, пры дапамозе якога яна быццам бы змагалася з ...цэлюлітам. Калі ўжо спартсменкі з ім змагаюцца, то што ўжо казаць аб простых смяротных?

**8.** Пад восьмым нумарам у рэйтынгу самых смешных эпізодаў з удзелам спартсменаў знаходзіцца ігрок прафесійнай лігі аўстралійскага футбола Бен Цыслоўскі. Хлопец правёў шраг матчаў з ...зубам саперніка ў сваім ілбе (інцыдэнт адбыўся ў матчы Кубка Куінсленда). Цікава, што пасля аперацыі спартсмен заявіў, што можа вярнуць зуб яго гаспадару. Дарэчы, гэта ўжо быў трэці выпадак у аўстралійскім футболе, калі ў баталіях на полі фігуруюць чужыя зубы.

**7.** Сёмую пазіцыю заняў паўабаронца мадрыдскага «Рэала» і маладзёжнай зборнай Галандыі Ройстан Дрэнтэ. Футбаліст, пэўна, настолькі «лятаў» у сваіх думках, што не заўважыў на дарозе паліцэйскую машыну і ўрэзаўся ў яе. ДТЗ адбылося прыкладна а палове пятай раніцы, калі ігрок выконваў разварот у цэнтры Мадрыда. Пры гэтым тэст на алкаголь станоўчым не аказаўся.

**6.** Уладальнік рэкорда 59 з паловай хот-догаў за 12 хвілін, японец Такеру Кабаясі (шматразовы рэкардсмен свету па хуткасным паяданні хот-догаў), траўмаваў сківіцу ў час ...падрыхтоўкі да чарговых спаборніцтваў. Галоўны «спартыўны снарад» Цунамі (такую мянушку далі Такеру) прыадкрываўся не больш, чым на палец.

**5.** Ці не смешна гэта? Бацькі англійскай дзяўчынкі назвалі дачку 25 імёнамі чэмпіёнаў свету па боксе ў цяжкай вазе, бо гэта ...сямейная традыцыя. Поўнае імя малой гучыць Отам Саліван Корбет Фітцсіманс Джэфрыс Харт Бернс Джонсан Уілард Дэмпсі Тані Шмелінг Шаркі Карнер Бэр Брэдак Луіс Чарльз Уолкат Марчыана Патэрсан Юхансан Лістан Клэй Фрэйзер Формэн Браун.

**4.** За крок ад п'едэсталу спартыўных кур'ёзаў засталася знакамітая кінаактрыса Сафі Ларэн. «Зорка» паабяцала паказаць стрыптыз, калі яе любімая футбольная каманда «Напалі» вернецца ў элітны дывізіён чэмпіянату Італіі. Аднак аказалася, што гэта быў толькі жарт. Актрыса заявіла, што яе абяцанне паказаць стрыптыз павінна было стымуляваць іграКоў дасягнуць поспеху ў гульні, якую яна так любіць.

**3.** Адкрывае тройку прызёраў гумарыстычнага рэйтынгу «Звязды» інцыдэнт у матчы першай лігі чэмпіянату Эстоніі. Гульня была спынена, бо на поле выбег ...голы мужчына. Такое ўжо ў футболе здаралася, за адным толькі адрозненнем: на гэты раз на полі гулялі жаночыя каманды, а хуліганам аказаўся мясцовы ...баскетбаліст, які, дзякуючы такім нестандартным паводзінам, выйграў заклад. Цікава, што суддзя нават не зафіксаваў гэты інцыдэнт у пратаколе.

**2.** «Срэбра» дастаецца камічнай гісторыі з 17-гадовай брытанкай Крысцінай Тэмбарас. У 2007 годзе дзяўчыне званілі з прапановамі аб ...праглядзе футбалістаў, хоць яна наўрад ці дапамагла б ігракам працаўладкавацца. Аказалася, што Крысціна не так даўно змяніла нумар мабільнага, а раней ён належаў экс-трэнеру зборнай Англіі Свену-Горану Эрыксану, які затым узначаліў клуб «Манчэстар Сіці». Цікава, што настаўнік пасля набыцця новага нумара здзіўлена казаў: «Мяне ніхто не павіншаваў з новым назначэннем!». Дзяўчыне ж прыходзілі sms з пажаданнямі ўдачы на новай пасадзе. А вам, дарэчы, чый тэлефонны нумар дастаўся?

**1.** Узначальвае рэйтынг спартыўных кур'ёзаў учынак эмацыянальнага абаронцы бразільскага клуба «Кабофрэнсэ» Клеберсана. Звычайна жоўтыя карткі ў футболе футбаліст атрымлівае за грубую гульню, але пераможца гумарыстычнай дзесяткі, па версіі «Звязды», быў пакараны за бурнае праяўленне эмоцый. Пасля справядлівага рашэння арбітра ў матчы з камандай «Ботафога» ігрок, на радасцях ...пацалаваў рэферы ў шчаку. Суддзя заявіў, што футбаліст не можа цалаваць арбітра. «Я не ведаў, што гэта супярэчыць правілам», — растлумачыў праяўленне сваіх пачуццяў пакараны Клеберсан.

**Падрыхтавала Ірына ПРЫМАК.**

# ІСПАНСКАЯ КРЫЖАВАНКА

**Крыжаванкі такога кшталту звычайна называюць «іспанскімі». У іх ёсць некалькі асаблівасцяў. Злева і справа ад «гульнявога поля» дадзены вызначэнні загаданых слоў па гарызанталях, а зверху і знізу — па вертыкалях. Дакладныя месцы для адгаданых слоў вам трэба шукаць самастойна. У дужках паказана, колькі літар павінна быць у адгаданых словах. І яшчэ: словы павінны аддзяляцца адно ад аднаго сама меней адной пустой клеткай. У якасці падказкі некаторыя з пустых клетак ужо заштрыхаваныя.**

Зверху: Нарматыўны дакумент урада (4) · Апарат для друкавання копій (7) · Састаўная частка малекулы (4) · Заданне або праца для вайскоўца (5) · Раствор смол у спірце, шкіпінары (3) · Адметнае возера на Віцебшчыне (2) · Апрацоўка хрусталю, каштоўнага каменю (7) · Прыродная мінеральная сыравіна (4) · Чалавек, які пацярпеў ад пажару (9) · Горнае памежжа паміж Азіяй і Еўропай (4) · Задыякальнае сузор'е (3)

Злева: Планета, якая круціцца «не ў нагу» з іншымі (4) · Пералік кніг у бібліятэцы (7) · Вялікі статак авечак (5) · Палац-крэпасць феадала (5) · Кветка, якой не палюбуешся з-за наркаманаў (3) · Абарыген поўначы Афрыкі (4) · Сядзіба І.Я. Рэпіна паблізу Віцебска (4) · Левы прыток Нёмана (5)

Справа: Стрыжань для смажання шашлыкоў (6) · Даўгахвосты папугай (3) · Металічны крук у бусаку (3) · Бяссцёкавае салёнае мора-возера ў Азіі (4) · Кручаная або вітая тонкая вяровачка (4) · Даўней: горад у Маньчжурыі (6) · Хлебны злак роду сорга (6) · Біблейская першая жанчына — прамаці (3) · Вобласць у Італіі з горадам Рымам (5) · Інертны газ (4) · Ударная частка механічнага молата (4) · Бразільскі паруснік на здымку (7) · Маладая авечка (4)

Знізу: Урачыстая, бравурная музыка (4) · Паверхня ствала, галінкі, кораня дрэва (4) · Інструмент для свідравання (3) · Струнны смычковы музычны інструмент (6) · Рыхлы губчаты лёд на паверхні і ў глыбіні (4) · «Фарфоравы» горад на поўнач ад Масквы (5) · Дзікі азіяцкі асёл (5) · Насавая частка палубы (3) · Здзелка, занятак без прыбытку (8) · Мыс на ўсходзе Іспаніі (3)



**Склаў Яўген ЛЯХАЎ.**

## Усміхнёмся!

Навасёлаў, якія толькі што заехалі ў панэльны дом, наведвае прыяцель. Падчас гутаркі ён раптам замаўкае і прыслухоўваецца:
— У вас ёсць мышы?
— Не, гэта суседзі ядуць салату.

☺

**Каб мужчына адчуў, што такое цяжарнасць, яму на кожную нагу трэба прывязаць па 1,5 кг крупаў, даць па таблетцы снатворнага і мачагоннага, на пояс прывязаць нешта кшталту жывата і адправіць на працу!**

☺

Учора ў Маскве на скрыжаванні сутыкнуліся аўтамабілі палкоўніка МУС і генерала ФСБ. Вінаватым была прызнаная машына ДІБДР, якая прыбыла на месца аварыі.

## СЁННЯ

| Сонца | Усход | Захад | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 6.42 | 19.46 | 13.04 |
| Віцебск — | 6.30 | 19.37 | 13.07 |
| Магілёў — | 6.32 | 19.36 | 13.04 |
| Гомель — | 6.30 | 19.31 | 13.01 |
| Гродна — | 6.57 | 20.01 | 13.04 |
| Брэст — | 7.00 | 20.00 | 13.00 |

**Месяц**
***Апошняя квадра 30 сакавіка — 5 красавіка.***
***Месяц у сузор'і Вадалея.***

**Імяніны**
***Пр.*** *Ганны, Івана, Парфірыя, Пятра, Севасцьяна, Сяргея.*
***К.*** *Бенядыкта, Канстанціна.*




**...у суседзяў**

| | | |
|---|---|---|
| ВАРШАВА +8..+10°С | КІЕЎ +8..+10°С | РЫГА +7..+9°С |
| ВІЛЬНЮС +7..+9°С | МАСКВА +6..+8°С | С.-ПЕЦЯРБУРГ +8..+10°С |

## Дзве даты — 1 красавіка

**1557 год** — прыняты «Статут на валокі», якім у Вялікім княстве Літоўскім была ўнармавана зямельная рэформа, што праводзілася з канца XV стагоддзя. У адпаведнасці з дакументам ставілася задача надзяліць кожную сялянскую сям'ю ўчасткам у 1 валоку (каля 20 га), пры панскіх дварах ствараліся фальваркі (гаспадарчыя маёнткі).



**1809 год** — нарадзіўся Мікалай Васільевіч Гогаль, выдатны рускі пісьменнік і драматург. Гогаль не любіў немцаў, але сярод ягоных любімых аўтараў былі Шылер і Гофман. Неяк у яго спыталі: «Вы лаеце немцаў, ну а Шылера ўсё-такі любіце, а ён жа таксама немец!» — «Шылер! — адказаў Гогаль. — Ды калі ён даведаўся, што быў немцам, дык з гора памёр. А вы думалі, ад чаго ён памёр?!»...

## Цытата дня:

***«Працiўнік, які шукае вашы памылкі, больш карысны, чым сябар, што хоча іх схаваць».***

**Леанарда да Вінчы (1452—1519), італьянскі жывапісец, скульптар, вучоны.**

*Сардэчна віншую з юбілеем* ***Вольгу Мікалаеўну БАЛТРУКАНІС*** *з Гродна. Жадаю шчасця, здароўя, каб на ўсё хапала сілаў, каб кожны пражыты табой дзень прыносіў толькі радасць.*

**Цётка Вера,** *в. Галынь.*

*Шчыра віншуем з днём нараджэння* ***Алену Мікалаеўну ЛЫСЮК*** *з Гомеля. Жадаем моцнага здароўя, поспехаў, удачы ў жыцці, радасных шчаслівых дзён.*

**Бацькі, дачушка.**

*Шчырыя пажаданні здароўя, удачы ва ўсіх справах, шчасця і сямейнага дабрабыту* ***Аляксандру ЧЭМКУ*** *з Івянца з нагоды юбілею.*

**СТАНКЕВІЧЫ.**

*Віншуем* ***Дзмітрыя Якаўлевіча ДЗЕРАНЧУКА*** *з днём нараджэння. Жадаем моцнага здароўя, поспехаў у працы, доўгіх шчаслівых гадоў жыцця.*

**Мама, браты,** *г. Масты.*

Хочаце — верце...

# ПАРАД ПЛАНЕТ У 2012 ГОДЗЕ МОЖА СТАЦЬ КАНЦОМ СВЕТУ?

**Цывілізацыя індзейцаў майя — найвялікшая загадка для сучасных навукоўцаў, нягледзячы на іх намаганні адкрыць нам старонкі далёкага мінулага. У часы заваявання Юкатана канкістадорамі былі знішчаныя амаль усе пісьмовыя крыніцы гэтай найстаражытнейшай на нашай планеце цывілізацыі. Да нашых дзён захавалася зусім няшмат звестак, здольных расказаць нам, адкуль жа з'явілася цывілізацыя майя, што стала прычынай яе заняпаду і хто даў індзейцам майя веды аб космасе і аб будучыні?**

Найвялікшым вынаходствам індзейцаў майя быў каляндар.

У аснову календара майя была пакладзена міфічная пачатковая дата — 13 жніўня 3113 года да нашай эры. Вось ад яе шляхам простага адліку колькасці прайшоўшых дзён і вялося летазлічэнне. Між іншым, і мы карыстаемся міфічнай датай «нараджэння Хрыста» для свайго летазлічэння.

Каляндар майя, нягледзячы на тое, што быў складзены шмат тысяч гадоў таму, надзіва дакладны. Па сучасных разліках, працягласць сонечнага года складае 365,2422 дня. Майя вылічылі значэнне ў 365,2420 дня. Розніца — усяго ў дзве дзесяцітысячныя. Для складання такога дакладнага календара, як лічаць вучоныя, патрэбна было б назіраць і запісваць рухі планет на працягу прыблізна дзесяці тысяч гадоў.

Адкуль у той час можна было атрымаць такія дакладныя разлікі? Калі верыць календару майя, у якім час падзелены на цыклы, канец нашага цыкла чакаецца 21 снежня 2012 года. Па легендах майя, кожны цыкл завяршаецца практычна поўным знішчэннем цывілізацыі, якая жыла ў гэтым цыкле.

Згодна з падлікамі вучоных, «Пятае Сонца» пачалося 13 жніўня 3113 года да нашай эры. Чаму менавіта тады? З якой падзеяй гэта было звязана? Невядома. Гэтак жа як і невядома, адкуль у старажытных майя наогул узялася іх складаная сістэма злічэння ходу часу і дзяленні яго на цыклы. Тым не менш, многія вераць, што сэнс тут быў. І на ўсю моц прарочаць. Прадказваюць катаклізмы, якія будуць азначаць наступленне наступнага Вялікага цыкла календара майя — «Шостай Эпохі Стварэння», або «Шостага Сонца».

Жрацы майя казалі, што з моманту стварэння роду людскога мінула ўжо чатыры цыклы, або «Сонцы». Змяніліся чатыры чалавечыя расы, якія загінулі падчас вялікіх катаклізмаў. І толькі нешматлікія людзі заставаліся жывымі, пакінуўшы наступным пакаленням звесткі аб тым, што адбылося.

«Першае Сонца» доўжылася 4008 гадоў і было разбуранае землятрусамі. «Другое Сонца» доўжылася 4010 гадоў



і было знішчана ўраганамі. «Трэцяе Сонца» доўжылася 4081 год і загінула ад агністага дажджу, які праліўся з кратэраў велізарных вулканаў. «Чацвёртае Сонца» (5026 гадоў) знішчыў патоп.

Цяпер мы жывём у апошні перыяд Пятай Эпохі Стварэння, або «Пятага Сонца». Яно вядома яшчэ і як «Сонца Руху». Майя лічылі, што пасля таго, як завершыцца цяперашні, 5126-гадовы цыкл, адбудзецца нейкі рух Зямлі, які пацягне за сабой знішчэнне нашай цывілізацыі. Самае цікавае, што 21 снежня 2012 года будзе парад планет. Сатурн, Юпітэр, Марс і Зямля выстраяцца ў адну лінію. Уласна падобныя парады планет былі і раней. Чым жа адрозніваецца парад планет 21 снежня 2012 года ад папярэдніх? Справа ў тым, што ў гэты дзень у лінію выстраяцца не толькі планеты сонечнай сістэмы, але і планеты іншых зорных сістэм, утварыўшы лінію ад цэнтра галактыкі. А гэта ўжо зусім іншая справа. Працэс можна параўнаць са стрэлкамі гадзінніка, калі яны становяцца на адзнаку 12 гадзін. Гэтая камбінацыя будзе азначаць пераход сусвету з адной сістэмы ў іншую.

Абапіраючыся на розныя вераванні і навуковыя здагадкі, да 2020 года на Зямлі прадказваюць як мінімум 12 апакаліпсісаў. Немалы спіс абяцае, што катаклізмы пачнуцца ў 2008 годзе, і, калі пашанцуе, Зямля працягне да 2020-га.

**2008-ы** — на Зямлю ўпадзе астэроід дыяметрам больш за 800 м.

**2009-ы** — зыходзячы з расшыфровак цэнтурый Настрадамуса Пітэрам Лоры, надыдзе Армагедон.

**2010-ы** — скончыцца нафта, і свет уступіць у вайну за рэсурсы.

**2011-ы** — канец каляндарнага цыкла майя. Досыць распаўсюджаная дата, калі, па розных вераваннях, адбудзецца канец свету. Магчыма, здарыцца сутыкненне з астэроідам 2005 YU55.

**2012-ы** — таксама доўгачаканы канец свету па календары майя. Дзеці індыга раяць падрыхтавацца, у 0,5 % насельніцтва ёсць шанц выжыць.

**2013-ы** — Рагнарок, ён жа Судны дзень.

**2014-ы** — астрафізікі кажуць, што да нашай Сонечнай сістэмы дабярэцца воблака касмічнага пылу, якая змятае ўсё на сваім шляху. Сумны канец свету...

**2015-ы** — канец 9576-гадавога цыкла, які прыводзіць да гібелі цывілізацыі.

**2016-ы** — Джэймс Хансен, даследчык кліматычнага стану на Зямлі, сцвярджае, што ў тым годзе растануць ледавікі, і вялікая частка сушы будзе затопленая.

**2017-ы** — канец свету па тэорыі іерархічных катастроф.

**2018-ы** — ядзерная вайна ад таго ж Настрадамуса.

**2019-ы** — магчымае сутыкненне з астэроідам 2002 NT7.

**2020** — Ісаак Ньютан, зыходзячы з прадказанняў Іаана Багаслова, разлічыў, што канец свету будзе менавіта ў гэтым годзе.

**Аднак, як кажуць у народзе, паміраць сабраўся, а жыта сей! На працягу многіх стагоддзяў апакаліпсіс нам абяцалі ледзь не ў кожным годзе. А мы, зямляне, усё жывём!**

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ:
Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь,
Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНЫ НУМАР 1.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ.
РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, Т. ПАДАЛЯК, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмная – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 24 31 92, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 7 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; даведкі па рэкламе і аб'явах тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.
http://www.zviazda.by E-mail: info@zvyazda.minsk.by

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя пакідае за сабой права не ўступаць у перапіску з аўтарамі. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.
Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку».
Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 33.662. Індэкс 63850. Зак. № 1711. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12